

# Ля вытокаў заснавання Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта

*Сёлета споўнілася 100 гадоў з часу заснавання ў Мінску настаўніцкага інстытута, які паклаў пачатак станаўленню тут педагагічнай адукацыі. У далейшым гэтая навучальная ўстанова некалькі разоў рэарганізоўвалася, стаўшы асновай для стварэння ў 1930-я гады педагагічнага інстытута, які з 1993 г. з'яўляецца Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэтам.*

Сістэма народнай адукацыі на тэрыторыі Беларусі мае доўгую гісторыю. Пачатак XX ст. стаў часам яе актыўнага пашырэння. З 1900 па 1914 гг. колькасць пачатковых і сярэдніх агульнаадукацыйных школ усіх тыпаў павялічылася з 6297 да 7682, а вось колькасць навучэнцаў у іх — з 248 тыс. да 489 тыс. чалавек[1]. Разам з тым якасны склад педагагічных кадраў і іх падрыхтоўка не адпавядалі запатрабаванням часу. Так, у Віленскай навучальнай акрузе, куды ўваходзілі беларускія губерні, па стане на студзень 1911 г. сярод настаўнікаў было 14,1% асобаў з сярэдняй свецкай, 17,5% — з сярэдняй духоўнай, 16,1% — з сярэдняй спецыяльнай педагагічнай, а з ніжэйшай і хатняй адукацыяй — 52,3%[2].

Недахоп педагагічных кадраў і якасці іх падрыхтоўкі павінны былі кампенсаваць настаўніцкія інстытуты, адкрытыя ў Віцебску (1910 г.), Магілёве (1913 г.) і Мінску (1914 г.).

22 чэрвеня 1914 г. імператар Мікалай II зацвердзіў даклад міністра адукацыі аб стварэнні **Мінскага настаўніцкага інстытута**, і ўжо 1 ліпеня дырэктарам інстытута быў прызначаны Дзмітрый Антонавіч Сцяпура, які праводзіў падрыхтоўчую работу па адкрыцці навучальнай установы[3]. Аднак Першая сусветная вайна і звязаныя з ёю цяжкасці стрымлівалі рамонт і прыстасаванне памяшканняў для інстытута, а таксама набор навучэнцаў. 2 кастрычніка адбыліся першыя ўступныя экзамены, на якія прыбыў 71 чалавек з 19 губерняў Расійскай Імперыі (у тым ліку 45 чалавек з беларускіх губерняў), якія мелі званне настаўніка пачатковых вучылішчаў. Уступныя экзамены паспяхова здалі 30 чалавек. Паводле ўзросту яны размеркаваліся наступным чынам: ад 19 да 20 гадоў — 6 чалавек, ад 21 да 25 гадоў — 17 чалавек, ад 26 да 30 гадоў — 5 чалавек, больш за 30 гадоў — 2 чалавекі. Ужо 18 кастрычніка пачаліся першыя заняткі, а 21 лістапада 1914 г. адбылося ўрачыстае адкрыццё Мінскага настаўніцкага інстытута, на якім прысутнічалі прадстаўнікі вышэйшай духоўнай і свецкай губернскай улады: епіскап Мінскі і Тураўскі Мітрафан, епіскап Слуцкі Феафілакт, мінскі губернатар А.Гірс, віцэ-губернатар М.Чаныкаеў, начальнік Мінскай ваеннай акругі барон Рауш фон Траўбенберг, а таксама прадстаўнікі мясцовай адміністрацыі і кіраўнікі ўсіх навучальных устаноў г. Мінска. На адкрыцці інстытута яго дырэктар Дз.Сцяпура сказаў: *"Дваццатае стагоддзе нярэдка называюць стагоддзем дзіцяці, стагоддзем педагогікі. Сапраўды, ніколі педагагічная думка не працавала так інтэнсіўна, як цяпер. Ідзе агульны сур'ёзны перагляд папярэдніх сістэм, метадаў і прыёмаў навучання і выхавання, намячаюцца новыя шляхі і плыні, ствараюцца новыя педагагічныя дысцыпліны, склікаюцца педагагічныя з'езды, прычым гэта цікавіць не толькі вузкія колы спецыялі-*



М. Н. П.
Виленскій Учебный Округъ.
ДИРЕКТОРЪ
Минскаго
Учительскаго Института.
Ноября 22 дня 1914 г.
№ 313
г. Минскъ.

Его Превосходительству.
Господину Попечителю Виленскаго Учебнаго Округа.

Донесеніе объ оффиціальномъ открытіи института.

Имѣю честь донести Вашему Превосходительству, что 21-го сего ноября въ два часа дня состоялся актъ открытія ввѣреннаго мнѣ учительскаго института. Предъ началомъ акта законоучитель института священникъ Николай Гамолко произнесъ рѣчь и совершилъ, въ сослуженіи съ соборнымъ діакономъ, установленное молебствіе. Актъ начался пѣніемъ гимна "Коль славенъ нашъ Господь". Затѣмъ мною была изложена исторія возникновенія института и его организація.

*Данясенне аб адкрыцці ў Мінску настаўніцкага інсітута.*

*стаў-педагогаў, але і шырокія слаі адукаванага грамадства..."*[4].

На момант адкрыцця інстытута яго педагагічны калектыў уключаў дырэктара і 6 выкладчыкаў: рускую і царкоўнаславянскую мовы выкладаў А.М.Нікольскі, матэматыку — Р.К.Астроўскі, гісторыю і геаграфію — У.М.Ігнатоўскі, прыродазнаўства і фізіку — К.І.Кудзін, маляванне і чарчэнне — А.І.Кандавураў, М.А.Гамолка быў законавучыцелем і настаўнікам спеваў[5].

Тэрмін навучання ў інстытуце складаў тры гады. Навучэнцамі маглі стаць мужчыны праваслаўнага веравызнання, якія мелі двухгадовы стаж працы настаўнікамі. Фінансаванне ўстановы адбывалася на бюджэтныя сродкі. Вучэбныя праграмы арыентаваліся на ўзровень сярэдняй школы. Педагагічныя дысцыпліны, багаслоўскі курс, гісторыя і літаратура выкладаліся па праграмах, набліжаных да ўзроўню вышэйшай школы.

У сувязі з пагрозай акупацыі Мінска ў верасні 1915 г. інстытут быў эвакуяваны ў Яраслаўль. 6 кастрычніка заняткі пачаліся ўжо на новым месцы. Да іх прыступілі 40 з 54 навучэнцаў, якія прыбылі з Мінска. Вучэбнаму працэсу перашкаджалі масавая мабілізацыя слухачоў, кватэрная неўладкаванасць і іншыя праблемы, аднак паступова ён наладжваўся. На 1 студзеня 1916 г. у інстытуце навучаліся 53 студэнты, з іх у 1-м класе — 24 чалавекі, у 2-м класе — 29 чалавек, усе праваслаўнага веравызнання. Па сацыяльным складзе яны размяркоўваліся наступным чынам: адзін дваранін, пяць мяшчан, два казакі, 45 сялян. У фундаментальнай бібліятэцы мелася 371 назва навуковай літаратуры, а ў вучнёўскай — 385 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў. Факультатыўна выкладаліся замежныя мовы.

1 верасня 1916 г. пры Мінскім настаўніцкім інстытуце былі створаныя аднагадовыя педагагічныя курсы для падрыхтоўкі настаўнікаў вышэйшых пачатковых вучылішчаў. На іх навучалася 77 дзяўчат, пераважна бежанак з Беларусі. Слухачкам чыталіся педагогіка, гісторыя педагагічных сістэм, кароткі курс вучылішчазнаўства. У час знаходжання ў Яраслаўлі інстытут стаў цэнтрам нацыянальнага руху беларускіх бежанцаў. Яго актыў арганізаваў Яраслаўскую беларускую раду. Па ініцыятыве У.Ігнатоўскага ў інстытуце была створана арганізацыя "Наш край"[6].

Падчас Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. і пасля яе выкладчыкі і студэнты інстытута актыўна ўдзельнічалі ў грамадска-палітычным жыцці Яраслаўля. Ужо ў першыя дні рэвалюцыі навучэнцы інстытута прынялі на сябе абавязкі міліцыянераў. У.Ігнатоўскі прачытаў лекцыі па актуальных праблемах, такіх як "Гісторыя вызваленчага руху ў Расіі", "Канстытуцыяналізм і парламентарызм", "Устаноўчы сход" і інш. Пры інстытуце працавала беларуская чытальня, была створана арганізацыя "Маладая Беларусь". Пасля ліквідацыі палітычных, рэлігійных, нацыянальных і полавых абмежаванняў у правах на адукацыю інстытут быў рэарганізаваны ў навучальную ўстанову змешанага тыпу (прымаліся грамадзяне абодвух полаў), у ім была ўведзена спецыялізацыя ў падрыхтоўцы настаўнікаў, у праграму ўключаны новыя дысцыпліны (палітэканомія, філасофія, сацыялогія і інш.). Выпускнікі інстытута атрымалі права паступаць па заканчэнні навучання ва ўніверсітэты[7].

21 жніўня 1918 г. выкладчык інстытута І.П.Каранеўскі ў якасці дэлегата ўдзельнічаў ва Усерасійскім з’ездзе дзеячаў па падрыхтоўцы настаўнікаў, на якім было прынята рашэнне аб рэарганізацыі настаўніц-



*Выкладчыкі і навучэнцы Мінскага настаўніцкага інстытута разам з іншымі навучэнцамі сустракаюць у Мінску імператара Мікалая II.* 22 кастрычніка 1914 г.


СВИДЕТЕЛЬСТВО.

Предъявитель сего Забелло Андрей Михайлович состоя студентом с 1918 г. литературно-художественного цикла Минского Педагогического Института, преобразованного в 1920 году в 3-е отделение Института Народного Образования, окончил в 1921-м году курс Института, при чем выполнил все установленные учебным планом практические занятия, дал практические уроки и получил зачеты по следующим предметам:

1. Психология, Педология и История научного мировоззрения
2. История всеобщая и методика истории
3. История Белоруссии
4. История русской культуры
5. Русская историография
6. История русской литературы с семинарием
7. Белорусский язык и литература
8. История всеобщей литературы
9. История искусств
10. Педагогическое рисование
11. Учение о праве и государстве
12. Политическая экономия
13. [illegible]
14. [illegible]
15. [illegible]

Посему на основании общих положений и ст. 21 Устава Педагогических Институтов, утвержденных Заместителем Народного Комиссара по Просвещению Р. С. Ф. С. Р. 19 ноября 1918 года Забелло имеет право преподавать в трудовой школе 1-й и 2-й ступени.

Г. Минск, 16 декабря 1921 года.

Председатель Совета

Заведующий 3-м отделением

Члены Совета

Секретарь Совета

*Пасведчанне аб заканчэнні інстытута.*

кіх інстытутаў у вышэйшыя аўтаномныя навучальныя ўстановы з мэтай падрыхтоўкі выкладчыкаў для адзінай працоўнай савецкай школы. Аднак 29 жніўня педагагічным саветам інстытута было прынята рашэнне аб рээвакуацыі навучальнай установы ў акупаваны нямецкімі войскамі Мінск. Адначасова была задаволена просьба Дз.Сцяпуры аб адстаўцы[8].

З 22 верасня 1918 г. інстытут зноў пачаў працаваць у Мінску, на той момант акупаваным нямецкімі войскамі. У праграму навучання былі ўведзены новыя дысцыпліны: беларуская мова і літаратура, гісторыя беларускай мовы і літаратуры, гісторыя і геаграфія Беларусі і інш. У поўным аб'ёме выкладаліся нямецкая, французская, англійская мовы. Навучанне было бясплатнае, пры інстытуце дзейнічала прыкладная школа. На 30 верасня слухачамі 3-га курса інстытута былі 42 чалавекі, з іх 33 — беларусы.

30 снежня 1918 г. на падставе хадайніцтва педагагічнага савета інстытута Цэнтральны народны камісарыят асветы выдаў прадпісанне (№ 4134) прыступіць да рэарганізацыі Мінскага настаўніцкага інстытута ў вышэйшую навучальную ўстанову[9]. На гэтую справу была выдаткавана сума ў памеры 497 тыс. руб.

**Мінскі педагагічны інстытут**, тэрмін навучання ў якім вызначаўся ў чатыры гады, складаўся з літаратурна-мастацкага, сацыяльна-гістарычнага, прыродазнаўча-геаграфічнага, фізіка-хімічнага і фізіка-матэматычнага факультэтаў (цыклаў), на якіх навучаліся 150 студэнтаў. Размяшчаўся ён у будынку былога Мінскага рэальнага вучылішча, меў фізічны і педагагічны кабінеты, хімічную лабараторыю, бібліятэку (5 тыс. тамоў). У карыстанне інстытуту быў перададзены былы Мінскі гарадскі музей, а пад Мінскам у акрузе Антонаўка за ім быў замацаваны фальварак, дзе знаходзіліся агранамічная, батанічная, заалагічная лабараторыі, біялагічны кабінет, птушнік, пчольнік, вопытнае сельскагаспадарчае поле, ферма, метэаралагічная станцыя. У адукацыйным працэсе асноўная ўвага надавалася педагагічным дысцыплінам, беларусазнаўству, рабіліся спробы перавесці навучанне на беларускую мову.

25 лютага 1919 г. Прэзідыум ЦВК ССРБ пастанавіў адкрыць на базе Мінскага педагагічнага інстытута дзяржаўны ўніверсітэт і асігнаваў на першапачатковыя патрэбы 1 млн руб. Ужо 22 сакавіка прадстаўнік урада Літоўска-Беларускай ССР разам з намеснікам народнага камісара асветы РСФСР М.Н.Пакроўскім падпісалі пратакол аб заснаванні Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і стварылі Маскоўскую і Мінскую камісіі. На іх былі ўскладзеныя абавязкі распрацаваць структуру ўніверсітэта і вучэбныя планы, падабраць кадры прафесарска-выкладчыцкага саставу, скласці каштарыс і знайсці памяшканні для работы ўніверсітэта[10].

Але неўзабаве пачалася польска-савецкая вайна. Пасля таго як Мінск быў заняты польскімі войскамі, будынак інстытута перайшоў пад шпіталь. Польскія акупацыйныя ўлады адмовіліся фінансаваць інстытут, але выдаткавалі часовы крэдыт у памеры 35 тыс. польскіх марак. Паводле пастановы Часовага Беларускага нацыянальнага камітэта (каардынацыйнага органа беларускага нацыянальнага руху) ад 15 верасня 1919 г., інстытут атрымаў назву **Мінскі беларускі педагагічны інстытут**. Для правядзення беларусізацыі вучэбнага працэсу і рэарганізацыі структуры інстытута была створана камісія на чале з У.Ігнатоўскім і Я.Карскім[11].

На працягу 1919/1920 навучальнага года выкладанне пераводзілася на беларускую мову, 6 факультэтаў былі рэарганізаваныя ў літаратурна-гістарычны і географа-прыродазнаўчы факультэты з фізіка-хімічным і фізіка-матэматычным аддзяленнямі. Таксама ў вучэбную праграму былі ўведзены такія курсы, як польская мова і літаратура, гісторыя Польшчы і польскай культуры.

Па ініцыятыве У.Ігнатоўскага ў студзені 1920 г. па-антыпольску настроеная частка студэнтаў і выкладчыкаў, а таксама члены радыкальнай плыні "Маладой Беларусі" стварылі Беларускую камуністычную арганізацыю. У знак пратэсту супраць польскага ўціску і ў сувязі з нязгодай з прапольскай арыентацыяй Часовага Беларускага нацыянальнага камітэта прэзідыум інстытута на чале з У.Ігнатоўскім падаў у адстаўку. Паводле пастановы Беларускай школьнай рады Міншчыны (арганізацыі, створанай польскімі войскамі) з 1 сакавіка 1920 г. Мінскі беларускі

педагагічны інстытут узначаліў Вацлаў Леанардавіч Іваноўскі (рэктар). На выкладчыцкую працу былі запрошаныя М.І.Гарэцкі, В.Д.Дружчыц, Х.П.Імшэнік, С.А.Любіч-Маеўскі, Л.Л.Більдзюкевіч, А.А.Данілевіч, І.У.Канчэўскі і іншыя асобы. Пры інстытуце былі заснаваныя аспірантура і спецыяльная камісія па распрацоўцы беларускай навуковай тэрміналогіі. У сакавіку 1920 г. кіраўніцтва інстытута прыняло рашэнне аб паступовай яго рэарганізацыі ў Беларускі ўніверсітэт[12].

Пасля вызвалення Беларусі ад польскай акупацыі ў жніўні 1920 г. інстытут быў рэфармаваны ў **Мінскі інстытут народнай адукацыі** і стаў рыхтаваць педагагічных работнікаў для пачатковых і сярэдніх школ, а таксама дашкольных устаноў. Афіцыйна інстытут складаўся з пяці аддзяленняў, аднак фактычна з іх дзейнічалі толькі тры: 1-е — для падрыхтоўкі педагогаў дашкольных устаноў; 2-е — для настаўнікаў пачатковых школ; 3-е — для настаўнікаў сярэдніх школ. У склад апошняга аддзялення ўваходзілі 5 факультэтаў (цыклаў): літаратурна-мастацкі, сацыяльна-гістарычны, прыродазнаўча-геаграфічны, фізіка-хімічны, фізіка-матэматычны. Колькасць студэнтаў складала амаль 500 чалавек, выкладчыкаў было 34. Старшынёй педагагічнага савета быў абраны М.Г.Маслаковец. Размяшчаўся інстытут у будынку былога Мінскага рэальнага вучылішча, дзе меліся фізічны, прыродазнаўчы, гістарычны, геаграфічны і педагагічны кабінеты, хімічная лабараторыя, бібліятэка (9,5 тыс. тамоў). Пры навучальнай установе дзейнічалі Мінскае навуковае педагагічнае таварыства, Мінскае таварыства гісторыі і старажытнасцяў.

У снежні 1920 г. была створана выдавецкая камісія, на шапірографе друкаваліся лекцыі выкладчыкаў. Інстытут меў цесныя сувязі з Маскоўскай педагагічнай акадэміяй, педагагічнымі таварыствамі пры Маскоўскім і Казанскім дзяржаўных універсітэтах. У інстытуце чыталі лекцыі Я.Ф.Карскі, У.І.Пічэта, Д.М.Кулагін, Ф.Ф.Турук, Р.Ю.Віпер, А.М.Беркенгейм і іншыя вядомыя навукоўцы.

17 красавіка 1921 г. пад кіраўніцтвам сакратара ЦБ КП(б)Б В.Г.Кнорына і старшыні ЦВК і СНК БССР А.Р.Чарвякова адбылася аб'яднаная нарада прадстаўнікоў ЦБ КП(б)Б, Прэзідыумаў ЦВК і СНК БССР, Часовага праўлення БДУ, Маскоўскай і Мінскай камісій, Наркамата асветы і кіраўніцтва прафсаюзаў БССР. На ёй была адзначана важнасць працы, праведзенай Часовым праўленнем і камісіяй прафесараў па падрыхтоўцы да адкрыцця ўніверсітэта. 20 чэрвеня на пасяджэнні педагагічнага савета Інстытута народнай адукацыі было прынята рашэнне аб рэарганізацыі яго ў педагагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта[13].

11 ліпеня 1921 г. адбылося ўрачыстае пасяджэнне партыйных, савецкіх і грамадскіх арганізацый, прысвечанае стварэнню Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. На сходзе з прамовамі выступілі сакратар ЦБ КП(б)Б В.Г. Кнорын, старшыня ЦВК БССР А.Р.Чарвякоў, рэктар універсітэта У.І.Пічэта і іншыя асобы[14].

З 1 верасня 1921 г., паводле ўказа Наркамата асветы БССР, 1-е і 2-е аддзяленні Мінскага інстытута народнай адукацыі ўвайшлі ў склад створанага Мінскага педагагічнага тэхнікума, а 3-е аддзяленне стала ядром факультэта грамадскіх навук БДУ[15], з якога ў 1922 г. быў вылучаны педагагічны факультэт. У 1931 г. на яго базе быў адкрыты **Беларускі дзяржаўны вышэйшы педагагічны інстытут**, які з 1935 г. стаў называцца **Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытутам імя А.М.Горкага**. У 1993 г. МДПІ атрымаў назву **Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт**, а ў 1995 г. універсітэту было нададзена імя народнага паэта Беларусі Максіма Танка.

За гады свайго існавання ўніверсітэт набыў высокую рэпутацыю, стаў вядучым навукова-метадычным і вучэбным цэнтрам у галіне педагагічнай адукацыі. Сёння тут працуюць вядомыя навукоўцы і педагогі, створаны навуковыя школы і інавацыйныя цэнтры.

За гады працы ВНУ падрыхтавана больш за 170 тыс. педагогаў. Сярод выпускнікоў універсітэта больш за 200 заслужаных настаўнікаў Беларусі, 7 Герояў Савецкага Саюза і Герояў Сацыялістычнай працы, каля 60 членаў Саюза пісьменнікаў, дзясяткі знакамітых навуковых і дзяржаўных дзеячаў, больш за 90 дактароў і 1500 кандыдатаў навук[16].

Сёння перад калектывам БДПУ стаіць задача пераўтварэння навучальнай установы ў сучасны вучэбна-навуковы і метадычны цэнтр нацыянальнай сістэмы бесперапыннай педагагічнай адукацыі, які здольны каардынаваць і арганізоўваць працу па развіцці галіны ў кантэксце запатрабаванняў грамадства і школы.

БДПУ налічвае каля 15 тыс. студэнтаў, якія навучаюцца па 76 педагагічных спецыяльнасцях і спецыялізацыях. Падрыхтоўка кадраў вышэйшай кваліфікацыі ажыццяўляецца па 48 спецыяльнасцях аспіран-



*Будынак галоўнага корпуса Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка.*



*Аляксандр Іванавіч Жук,*
*рэктар БДПУ імя Максіма Танка.*

туры і 18 спецыяльнасцях дактарантуры. Колькасць аспірантаў і суіскальнікаў перавышае 300 чалавек[17].

У структуру ўніверсітэта ўваходзяць: 13 факультэтаў, 62 кафедры, Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі, розныя структурныя падраздзяленні (Цэнтр інфармацыйных тэхналогій, Цэнтр па праблемах развіцця педагагічнай адукацыі, вучэбна-выдавецкі цэнтр і інш.). Прафесарска-выкладчыцкі склад налічвае каля 1000 чалавек, з якіх больш за 400 маюць навуковыя ступені і званні.

Ва ўніверсітэце функцыянуюць 2 доктарскія і 2 кандыдацкія саветы па абароне дысертацый па гістарычных, псіхалагічных і педагагічных навуках. За апошнія тры гады аспірантамі, дактарантамі і суіскальнікамі навуковых ступеняў у іх абаронены 70 дысертацый[18].

Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт як вядучая вышэйшая навучальная ўстанова педагагічнага профілю каардынуе ўсю вучэбна-метадычную працу ўніверсітэтаў рэспублікі, якія забяспечваюць падрыхтоўку педагагічных кадраў. Навукоўцамі распрацаваныя адукацыйныя стандарты па ўсіх спецыяльнасцях вышэйшай педагагічнай адукацыі, падрыхтавана новае пакаленне вучэбных планаў і праграм, падручнікаў і дапаможнікаў для нацыянальнай вышэйшай педагагічнай школы.

Выкладчыкі БДПУ бяруць удзел у выкананні тэм па 11 дзяржаўных комплексных і фундаментальных праграмах навуковых даследаванняў, сярод якіх "Гісторыя, культура, грамадства, дзяржава", "Электроніка", "Эканоміка і грамадства", "Рэсурсы расліннага і жывёльнага свету" і інш. 18 навуковых праектаў выконваюцца ў рамках галіновай праграмы "Адукацыя і здароўе" і 6 заданняў — у рамках Прэзідэнцкай праграмы "Дзеці Беларусі".

Актыўна праходзіць інтэграцыя ўніверсітэта ў сусветную адукацыйную і навуковую прастору. За апошнія гады значна пашырылася міжнароднае супрацоўніцтва БДПУ з універсітэтамі 62 замежных краін.

Дамінантнай стратэгіяй развіцця ўніверсітэта на будучыню з'яўляецца дасягненне адпаведнасці якасці педагагічнай адукацыі актуальным і перспектыўным запатрабаванням асобы, грамадства, дзяржавы на аснове ўдасканалення яе структуры і зместу, а таксама кадравага і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння прафесійнай падрыхтоўкі творчай асобы педагога.

---

[1] История педагогического образования Беларуси / под общ. ред. А.И.Андарало. Мн., 2011. С. 13.
[2] Там жа. С. 15.
[3] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей — НГАБ). Ф. 478, воп. 1, спр. 132, арк. 7.
[4] Там жа. Спр. 1, арк. 36.
[5] Там жа. Спр. 68, арк. 1 адв.
[6] Ляхоўскі У. Мінскі настаўніцкі інстытут // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Т. 5. Мн., 1999. С. 190.
[7] Там жа.
[8] НГАБ. Ф. 478, воп. 1, спр. 103, арк. 46.
[9] Там жа. Арк. 79 адв.
[10] Кажушкоў А.І., Яноўскі А.А. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Т. 1. Мн., 1993. С. 430.
[11] Ляхоўскі У. Мінскі беларускі педагагічны інстытут // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Т. 5. С. 183.
[12] Там жа.
[13] Ляхоўскі У. Мінскі інстытут народнай адукацыі // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Т. 5. С. 186.
[14] Кажушкоў А.І., Яноўскі А.А. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. С. 429.
[15] Ляхоўскі У. Мінскі інстытут народнай адукацыі. С. 186.
[16] Бягучы архіў БДПУ за 2014 г.
[17] Там жа.
[18] Там жа.

***Аляксандр Андарала,***
*кандыдат педагагічных навук,*
***Анатоль Жытко,***
*доктар гістарычных навук,*
***Мікалай Забаўскі,***
*доктар гістарычных навук.*